Я.Л. Маліноўскі (Мінск)

Псіхалагічная культура мованосьбіта

Паўстань з народу нашага, Ўладар,
Адбудаваць свой збураны пасад,
Бо твой народ забыў, хто гаспадар
І хто яго абдзёр з каронных шат.

На Ўладара жджэ Беларусь даўно,
І жджэ цябе ўладарства Божы дар,
Вялікае, магутнае яно…
Пад беларускі сцяг прыйдзі, Ўладар! [2, с. 276–277]

Як вялікі паэт, Янка Купала гучна прамаўляў свой верш "Паўстань", як немачны чалавек перад спробай самагубства ў 1930 г., ён раскаяўся "ў сваіх такіх ці іншых памылках" перад старшынём ЦВК БССР А.Г. Чарвяковым з прычыны публікацыі гэтага верша ў 1920 г. [2, с. 580]. Псіхалагічным фактам з'яўляецца моцнае перажыванне паэтам сваёй залежнасці ад цемрашальскай улады. Памылковае пачуццё ўласнай віны з наступствамі самаабвінавачвання заўжды выклікае дэпрэсіўны стан з суіцыдальнымі рэакцыямі. Дэпрэсія, па смеламу меркаванню М. Сэлігмана, можа ў меншай ступені залежаць ад рэчаіснай немагчымасці вырашэння праблем, чым ад accretion learning, выпрацоўкі неадэкватных мадэляў паводзін пад уплывам частых канцэнтраваных асацыяцый ды ўпэненансці ў тым, што нічага нельга зрабіць. Невядома, як кожны з нас адчуваў бы сябе на месцы паэта ў тыя крывавыя часы. Таму даследаванні такога аспекту асобы, як "генералізаваныя чаканні" (Дж. Ротэр, 1958) былі накіраваны на вымярэнне ступені ўспрымання ўзнагароды ды яе адсутнасці як выніку уласных паводзін, або чагосьці абсалютна ад іх незалежнага. Аказалася, што рэспандэнты з "унутраным локусам кантролю", якія бачылі прычыну цяжкасцей ва ўласных асаблівасцях, значна больш пакутуюць на дэпрэсіі, чым носьбіты "прывучанай дапаможнасці" (М. Сэлігман, 1967), якія ва ўсім вінавацілі вонкавую сітуацыю ды іншых людзей, але пры гэтым не дэпрэсавалі [3, с. 445]. Відавочна, Янка Купала адносіцца да першай тыпалогіі, уяўляючы сабой прэцэдэнт супярэчлівасці носьбіта мовы і псіхалагічнай культуры ў адзінай асобе.

Апісаныя абставіны і натхнілі нас на правядзенне псіхалагічнага даследавання, мэтаю якога сталася выяўленне суадносін паміж гатоўнасцю да лінгвістычнага выбару асобы і ўзроўнем яе псіхалагічнай культуры. З ўдзелам 274 студэнтаў педагагічнага факультэта Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта былі створаны ўмовы для псіхалінгвістычнай гатоўнасці асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праз вывучэнне дысцыпліны “Псіхалогіія рэлігіі” на беларускай мове. Узровень псіхалагічнай культуры студэнтаў аналізаваўся ў сувязі з канцэптуальным асэнсаваннем гэтай з’явы Б.С. Братусям, Я.Л. Каламінскім, Я.А. Клімавым, Л.С. Калмагоровай, М. Коэлам, А.А. Лявонцьевым, А.І. Матковым, Т.А. Огневай, В.В. Семікіным, В.І. Слабодчыкавым, Т.В. Шубніцкай, Е.Я. Смірновай, У.А. Янчуком, а таксама з дапамогай выпрацаванай намі методыкі фрэймінга псіхалагічнай культуры [4, с. 137].

Выкладанне тэорыі псіхалагічнай культуры неўзабаве было атакавана студэнтамі, якія ўказвалі на неадпаведнасць беларускай мовы ўніверсітэту, яе бесперспектыўнасць у грамадстве і непатрэбнасць у сям’і, хіба што ў касцёле. Да ацэнкі гэтых студэнтаў далучылася спачатку аж дзве трэціны рэспандэнтаў, адказы якіх сталіся негатыўнай рэакцыяй на пытанне: “ці маеце Вы намер больш дасканалага авалодання беларускай мовай?”. Адказваючы на іншае пытанне – “ці адчуваеце ў сабе грамадзянскі абавязак мованосьбіта?” – толькі дзясятая часка апытаных выявіла сваё нацыянальнае пачуццё. Што датычыцца пытання навуковай перспектывы – “ці звязваеце сваю навуковую працу (у тым ліку курсавую) з магчымасцю яе публікацыі на беларускай мове?” – толькі адзіны юнак адказаў станоўча. На гэтым сумным фоне наколькі ж радасна выглядалі вынікі апытання, праведзенага напрыканцы семестру, пасля вывучання курса “Псіхалогія рэлігіі”: Ужо большая палова апытаных выказалася станоўча пра перспектыву авалодання беларускай мовай, амаль столькі ж студэнтаў адшукалі ў сабе грамадзянскі абавязак. Што ж да навуковай дзейнасці на роднай мове, дык да яе захацелі далучыцца, апрача названага юнака, яшчэ тры дзяўчынкі. Сваі рашэнні займацца навукай на беларускай мове яны каментавалі такім чынам: “Хтосьці мусіць быць першым?”; “Трэба падтрымліваць культуру краіны, у якой жывеш”; “Хоць нейкая будзе карысць ад той навукі”. Менавіта тыя студэнты, якія адкрылі ў сабе станоўчыя адносіны да мовы, адпаведна свайму лінгвістычнаму намеру прадэманстравалі ўзровень псіхалагічнай культуры вышэй за сярэдні, па дадзеных методыкі А.І. Маткова. Ужо іншае стаўленне да ўжывання беларускай мовы ў сям’і выказалі менавіта тыя студэнты, якія пабожна адносіліся да яе ў касцёле.

На наш погляд, дадзеная станоўчая дынаміка культурна-псіхалагічнай гатоўнасці ва ўмовах дыскурсу з’яўляецца яскравым пацвярджэннем глабальнай гіпотэзы Н. Хомскага, які лічыць, што развіццё мовы амаль цалкам дэтэрмінавана яе біялагічнай прыродай, бо лёгкасць, з якой яна засвайваецца на граматычным узроўні, занадта незвычайная, каб яе можна было растлумачыць толькі сацыяльнымі прынцыпамі навучання. Больш таго, сведчыць аўтар, значная колькасць дзіцячых памылак вынікае з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашырэння агульна-граматычных правілаў. Згодна яго пазіцыі, вучыць дзіця мове – тое ж самае, што “не замінаць кветцы расці” [3, с. 277]. Калі ж соцыум вырашае, якая мова яму больш, а якая менш даспадобы, тады “прыроджаная ўніверсальная граматыка” (Homsky, 1972) саступае месца ідэалогіі.

Што ж да ўплыву мовы на псіхалагічную культуру, а праз яе на мысленне, дык існуючая гіпотэза лінгвістычнай адноснасці Лі Уорфа вызначае нацыянальныя мовы ў якасці “дыктатараў” розных канцэпцый рэчаіснасці [3, с. 281]. Ідэя Уорфа рэдка падтрымліваецца людзьмі, якія размаўляюць на адной мове, для іх мова – толькі сродак перадачы думак. Але той, хто размаўляе на дзвюх ці больш мовах, згодзен з тым, што “сама мова вызначае асаблівасці мыслення чалавека” (Whorf, 1956).

Здольнасць нацыянальнай мовы ўплываць на мысленне робіць фармаванне слоўнікавага запасу асноўнай задачай псіхалогіі адукацыі. Даследванне Д. Прымака канстатуе той факт, што малпы, навучаныя мове, лягчэй успрымаюць адпаведнасць напалову запоўненага цаліндра і паловы яблыка ў параўнанні з ненавучанымі, якія не могуць уцяміць гэтай аналогіі (D. Prymak, 1983). Падчас праходжання на беларускай мове дысцыпліны “Псіхалогія рэлігіі” студэнты самі імкнуліся ўсталяваць трансдукцыю яўрэйскага імені *Хава* (бібл. Ева) у беларускім тэрміне “вы*/хава/*нне”, высвятляючы яго змест як выхавання, вымання таго, хто ці што было за*/хава/*на. Вядома, такая трансдукцыя суправаджаецца абдукцыяй, або адхіленнем сэнсу ад агульнаўсталяванага значэння. Але ўсялякая дэфініцыя, паводле “дэканструкцыі сэнсаў” Ж. Дэрыда, ёсць толькі гіпатэтычны аб’ект уласнай фальсіфікацыі. Металагічны спектр культуры напоўнены зрокавымі, слухавымі, кенастэтычнымі ды інш. вобразамі рэчаіснасці, паводле якіх тая канцэпцыя псіхалагічнай культуры, якая не знаходзіць месца для “прэзумпцыі сэнта-целеа-тэа-фала-фона-лага-цэнтрызму” (Ж. Дэрыда, 1991), застаецца пункава цвёрдай, але пустой унутры. Псіхалагічныя даследаванні мыслення і мовы пацвярджаюцца тымі напрацоўкамі, якія існуюць у літаратуры, мастацтве, рэлігіі. У адказныя, вырашальныя моманты жыцця мы асабліва востра адчуваем трымценне перад уладай новай мовы: “Кожная мова, – па словах В. Гумбальта, – апісвае вакол народа, якому яна належыць, уладнае кола, па-за межы якога можна выйсці толькі ў выпадку падуладнага прыняцця іншага кола” [W. Humboldt, 1975]. Мяняецца мова – мяняецца ментальнасць, падуладна якой знікае перажыванне як прадмет псіхалогіі. У такім выпадку, вынаходлівасць яе карыстання сведчыць за тое, што магчымасць набыцця ці страты мовы ў гэтым свеце – пытанне асабістага выбару Логаса. Калі філасофія панавачасся (postmodernism) культывуе элімінацыю самога прадмета псіхалагічнага даследавання, дык змена

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навуковай парадыгмы адбываецца пры пераходзе ад фіксавання кагнітыўных механізмаў самарэалізацыі “Я” да наступстваў мэтанарацый ў лінгвістычна канстытуцыйным свеце. Выхад па-за межы акадэмічных рэсурсаў даследавання, па меркаванню У.А. Янчука, адбываецца ва ўмовах крызісу мадэрнісцкай псіхалогіі, яе апантанасці аўтарытэтамі, што, як след, індукуе негатыўныя адносіны да панавачаснага дыскурсу. Для вырашэння гэтых супярэчнасцяў аўтар прапануе пераключыць ўвагу з суб’екта абазнанасці на самыя веды, таксама з унутранай істоты індывідуальнай душы да культуралагічнага быцця чалавека з іншымі. Пры дадзеных абставінах страчваюць сваю вагу такія паняцці, як бессвядомае, псіхіка, вобраз “Я” і актуалізуецца архітэктоніка сучасных моўна-культурных ландшафтаў (У.А. Янчук, 2000). У Беларусі існуе “ландшафт” сакральных моў, якія ў той ці іншай ступені адгукаюцца ў сэрцы верніка. Гэта царкоўнаславянская, польская ды беларуская мовы. Першая мае старажытнае і традыцыйнае дачыненне да рытуальнага служэння з традыцыяй начотніцтва і празмернай прыхільнасці да аўтарытэтаў. Польская, касцельная мова мае дынамічнае дачыненне да культуры Беларусі, вытокам якой сталася “Litwo, ojczyzno moja” (А. Міцкевіч). Відавочна, што найбольш ужываная расійская мова ніколі не была сакральнай. Адсюль перспектыва гістарычнага выбару жыцця ўяўляе сабой таямніцу збавення беларускай мовы. Калі вонкавы, гістарычны кантэкст краіны мінучы, дык дар мовы канчатковы. У такім разе праз беларускую сакральнасць адкрываецца час мовы, якая ў сваім падарожжы насустрач Логасу няспынна атрымлівае ад Духу, супольнага ў веры, надзеі любові. Гэты Дух асвячае і пасылае асобу на “псіхалагічную пропаведзь” (Я.Л. Каламінскі, 2003), магчымую толькі “ад набытку сэрца” [1, Лк 6, 45]. Практычна ніхто не навучае ў Беларусі па-славянску, зусім мала па-польску, у асноўным па-расійску. Але пэўная адукацыя пазбаўлена сакральнасці, таямніцы культурнага домабудавання. Можа, для дэсакралізаванай навукі гэта і адпаведна, але ж не для асобы мованосьбіта, у якой дарам Духу вызначаюцца часіны ратавання шматлікіх народаў з Вавілона рабства, натоўпу пакутлівасці ды маўклівасці. Уладар Логас паўстае з народу, каб прывесці яго да здзіўлення і нацыянальнай годнасці.

Літаратура

1. Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў. – Мінск : Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, 2012. – 1120 с.

2. Купала, Я. Выбраныя творы / Я. Купала. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2002. – 640 с.

3. Майерс, Д. Псіхалогія / Д. Майерс. – Мінск : ТАА “Лекцыя”, 1997. – 680 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Маліноўскі, Я.Л. Тэапсіхалогія / Я.Л. Маліноўскі. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2012. – 423 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ